ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2025 № 446

# Білеты
# для правядзення экзамену ў парадку экстэрнату
# пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы
# сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце
# «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка»

2025/2026 навучальны год

# ДАПРЫЗЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА

## Указанні да білетаў

Пры правядзенні экзамену ў парадку экстэрнату пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» правяраецца ўзровень тэарэтычных ведаў і практычнае валоданне вучнямі ўменнямі і навыкамі ў межах патрабаванняў, вызначаных адукацыйным стандартам і вучэбнай праграмай «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» для X – XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Білеты змяшчаюць два тэарэтычныя і адно практычнае пытанне. Экзамен у парадку экстэрнату праводзіцца ў вуснай форме, трэцяе пытанне выконваецца практычна. Для падрыхтоўкі да адказу на экзамене вучню адводзіцца не больш за 30 хвілін. Падчас падрыхтоўкі вучань можа рабіць пазнакі.

Забеспячэнне неабходнымі маёмасцю і сродкамі для выканання практычнага задання ажыццяўляецца педагагічнымі работнікамі ўстаноў адукацыі, на базе якіх праводзіцца атэстацыя ў парадку экстэрнату.

### Білет № 1

1. Гераічныя подзвігі беларускіх партызан на акупіраванай тэрыторыі (1941–1944 гг.).
2. Асноўныя характарыстыкі танка Т-72 Б (маса, хуткасць, далёкасць стральбы).
3. Выкананне паваротаў на месцы, выхад са строю і вяртанне ў строй.

### Білет № 2

1. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» аб парадку праходжання тэрміновай ваеннай службы.
2. Прызначэнне і баявыя ўласцівасці ручных асколачных гранат РГД-5, РГН.
3. Выкананне руху страявым шагам.

### Білет № 3

1. Прынцыпы міжнароднага гуманітарнага права (МГП).
2. Верагодныя памылкі ў прыцэльванні.
3. Практычнае ажыццяўленне выбару прыцэлу і кропкі прыцэльвання (для аўтамата АК-74).

Білет № 4

1. Агульнае ўстройства гранат РГА, Ф-1.

2. Асноўныя палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь аб воінскім абавязку і воінскай службе.

3. Практычнае ажыццяўленне сардэчна-лёгачнай рэанімацыі на манекене.

Білет № 5

1. Абарончы характар ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь.

2. Агнявыя сродкі, якія прымяняюцца мотастралковым аддзяленнем у баі.

3. Вымярэнне адлегласцей па карце.

Білет № 6

1. Змест і парадак прыняцця Ваеннай прысягі.

2. Асноўныя характарыстыкі БМП-2 (маса, хуткасць, далёкасць стральбы).

3. Выбар і заняцце пазіцыі для стральбы.

Білет № 7

1. Гісторыя фарміравання Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

2. Меры бяспекі пры стральбе.

3. Скласці схему руху па азімутах.

Білет № 8

1. Канструкцыя, прызначэнне, прынцып работы асноўных частак і механізмаў АК-74.

2. Паражаючыя фактары ядзернага выбуху.

3. Зараджанне зброі, падрыхтоўка гранат.

Білет № 9

1. Абавязкі ваеннаслужачага па выкананні воінскай дысцыпліны.

2. Выбар кропкі прыцэльвання, карэкціроўка стральбы.

3. Накладанне асептычнай павязкі пры скразным агнястрэльным раненні.

Білет № 10

1. Баявыя магчымасці узброеных сіл Польшчы.

2. Умоўныя тапаграфічныя знакі.

3. Практычнае накладанне жгута для спынення артэрыяльнага крывацёку (на манекене).

Білет № 11

1. Роля Узброеных Сіл у забеспячэнні нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

2. Віды дысцыплінарных спагнанняў, якія накладаюцца на ваеннаслужачых тэрміновай службы.

3. Накладанне павязкі для спынення крывацёку з выкарыстаннем пакета перавязачнага індывідуальнага.

Білет № 12

1. Дзяржаўная палітыка па ўмацаванні ў грамадстве патрыятызму.

2. Меры бяспекі пры абыходжанні са зброяй.

3. Чыстка і змазка аўтамата.

Білет № 13

1. Роля Узброеных Сіл у забеспячэнні нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

2. Класіфікацыя атрутных рэчываў па іх уздзеянні на арганізм чалавека.

3. Няпоўная разборка аўтамата Калашнікава (АК-74).

Білет № 14

1. Характэрныя рысы сучасных узброеных канфліктаў.

2. Уплыў знешніх умоў на палёт кулі.

3. Вызначэнне магнітнага азімуту на мясцовы прадмет з дапамогай компаса.

Білет № 15

1. Віды заахвочванняў, якія прымяняюцца да ваеннаслужачых тэрміновай службы.

2. Агляд пацярпелага, прыкметы жыцця.

3. Зборка аўтамата Калашнікава (АК-74) пасля яго няпоўнай разборкі.

Білет № 16

1. Начальнікі і падначаленыя. Парадак аддачы і выканання загадаў.

2. Прамы выстрал, яго практычнае прымяненне.

3. Надзяванне і зняцце процівагаза.

Білет № 17

1. Крымінальная адказнасць за ўхіленне ад прызыву.

2. Віды радыеактыўнага выпраменьвання.

3. Выкананне гатоўнасці да стральбы.

Білет № 18

1. Асноўныя напрамкі далейшага развіцця беларускай арміі.

2. Вызначэнне бакоў гарызонту без компаса.

3. Надзяванне агульнавайсковага ахоўнага камплекта (ААК) у выглядзе плашча ў рукавы і яго зняцце.

Білет № 19

1. Абавязкі салдата.

2. Спосабы аховы ад таксічных хімічных рэчываў.

3. Накладанне павязкі ў выпадку пранікальнага ранення ў плеўральную поласць.

Білет № 20

1. Воінскія званні, устаноўленыя ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь.

2. Навучальныя ўстановы вышэйшай адукацыі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаўных органаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

3. Выкананне паваротаў у руху.

# МЕДЫЦЫНСКАЯ ПАДРЫХТОЎКА

## Указанні да білетаў

Пры правядзенні экзамену ў парадку экстэрнату пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» правяраецца ўзровень тэарэтычных ведаў і практычнае валоданне вучнямі ўменнямі і навыкамі ў межах патрабаванняў, вызначаных адукацыйным стандартам і вучэбнай праграмай «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» для X–XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Экзамен у парадку экстэрнату праводзіцца ў вуснай форме. Для падрыхтоўкі да адказу на экзамене вучню адводзіцца не больш за 30 хвілін. Падчас падрыхтоўкі вучань можа рабіць пазнакі.

Білет складаецца з трох пытанняў, з якіх трэцяе – практычнае. Забеспячэнне неабходнымі маёмасцю і сродкамі для выканання практычнага задання ажыццяўляецца педагагічнымі работнікамі ўстаноў адукацыі, на базе якіх праводзіцца атэстацыя ў парадку экстэрнату.

### Білет № 1

1. Прынцыпы аказання першай дапамогі пацярпелым. Рэанімацыя. Правілы транспарціроўкі пацярпелых на насілках і з дапамогай падручных сродкаў.
2. Эпідэмія, пандэмія, эпідэмічны ачаг, эпідэмічны працэс.
3. Тэхніка правядзення комплексу рэанімацыйных мерапрыемстваў.

### Білет № 2

1. Паняцце пра рану. Папярэджанне магчымых ускладненняў пасля раненняў.
2. Прадметы догляду за хворымі: паільнік, мочапрыёмнік, судно падкладное, гумавы круг, піпетка, грэлка гумавая, пузыр з лёдам, кружка Эсмарха.
3. Першая дапамога і правілы яе аказання пры артэрыяльным крывацёку ў пацярпелага.

### Білет № 3

1. Крывацёк. Віды крывацёкаў: вонкавы і ўнутраны, капілярны, артэрыяльны, вянозны, змешаны. Спосабы часовага спынення крывацёку.
2. Магчымыя рэакцыі арганізма на лекі, ускладненні. Аказанне першай дапамогі ў выпадках алергічнай рэакцыі на лекавы сродак.
3. Тэхніка накладання кроваспыняльнага жгута на сцягно.

Білет № 4

1. Перавязачны матэрыял. Агульныя правілы накладання павязак. Выкарыстанне падручнага матэрыялу для накладання павязак.

2. Паняцце пра лячэбнае харчаванне. Харчаванне хворых людзей. Харчовы рацыён.

3. Тэхніка накладання першаснай асептычнай павязкі на галенастопны суставў.

Білет № 5

1. Удары мяккіх тканак. Расцяжэнні і разрывы звязак, сухажылляў і мышцаў. Вывіхі. Прыкметы, першая дапамога пры траўмах мяккіх тканак.

2. Першая дапамога: мэты і задачы, значэнне.

3. Першая дапамога пры электратраўме, алгарытм яе аказання.

Білет № 6

1. Віды і прыкметы пераломаў костак канечнасцей.

2. Хваробы органаў дыхання (востры бранхіт, пнеўманія, бранхіяльная астма): асноўныя сімптомы, прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі, асаблівасці догляду, прафілактыка.

3. Тэхніка накладання шыны пры пераломе костак перадплечча.

Білет № 7

1. Асаблівасці пераломаў у дзяцей і дарослых людзей. Траўматычны шок пры пераломах. Транспартная імабілізацыя.

2. Хваробы органаў кровазвароту (стэнакардыя, інфаркт міякарда, гіпертанічная хвароба, беспрытомнасць, інсульт): асноўныя сімптомы, прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі, асаблівасці догляду, прафілактыка сардэчна-сасудзістых парушэнняў.

3. Тэхніка накладання шыны пры пераломе бедранай косткі.

Білет № 8

1. Апёкі па пашкоджвальным фактары (тэрмічныя і хімічныя) і глыбіні паражэння (I–IV ступені) і іх характарыстыка. Першая дапамога пры апёках і правілы транспарціроўкі абпаленых.

2. Хваробы органаў стрававання (востры гастрыт, язвавая хвароба страўніка і дванаццаціперснай кішкі, вострая пячоначная коліка): асноўныя сімптомы, прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі, асаблівасці догляду, прафілактыка.

3. Тэхніка накладання першаснай асептычнай павязкі на абпаленую паверхню пацярпелага.

Білет № 9

1. Абмаражэнні па глыбіні паражэння (I–IV ступені) і іх характарыстыка. Першая дапамога ў палявых і хатніх умовах.

2. Цукровы дыябет: асноўныя сімптомы, прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі, асаблівасці догляду за хворымі, прафілактыка.

3. Тэхніка правядзення непрамога масажу сэрца.

Білет № 10

1. Утапленне: віды ўтапленняў (сапраўднае, асфіксічнае, сінкапальнае) і іх прыкметы. Першая дапамога пры ўтапленні. Прафілактыка ўтапленняў.

2. Хваробы органаў мочавыдзяляльнай сістэмы (востры піеланефрыт, востры цыстыт, нырачная коліка): асноўныя сімптомы, прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі, асаблівасці догляду, прафілактыка.

3. Тэхніка правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх.

Білет № 11

1. Сонечныя і цеплавыя ўдары: прычыны, прыкметы, першая дапамога. Прафілактыка цеплавых і сонечных удараў.

2. Міжнародны рух Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца: мэты, задачы, асноўныя прынцыпы, гуманітарная дзейнасць. Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа і яго дзейнасць у развіцці і рэалізацыі гуманітарнага права.

3. Тэхніка вымярэння артэрыяльнага ціску.

Білет № 12

1. Атручэнні хімічнымі рэчывамі: прыкметы, першая дапамога, прафілактыка.

2. Кішэчныя інфекцыі (брушны тыф, дызентэрыя, вірусны і сывараткачны гепатыты): крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы, асаблівасці догляду, прафілактыка.

3. Вымярэнне тэмпературы цела.

Білет № 13

1. Харчовыя атручэнні: прыкметы, першая дапамога, прафілактыка.

2. Асабістая гігіена хворых людзей. Змена нацельнай і пасцельнай бялізны. Догляд за скурай. Мыццё і абціранне цяжкахворых. Гігіена поласці рота, вачэй, вушэй, носа. Пролежні. Прафілактыка пролежняў.

3. Падлік пульсу.

Білет № 14

1. Паняцце пра лекавыя прэпараты. Лекавыя формы. Асноўныя групы лекавых прэпаратаў: антысептычныя і дэзынфецыруючыя, процімікробныя, сардэчна-сасудзістыя, абязбольвальныя, антыалергічныя, гарачкапаніжальныя, процікашлевыя і адхарквальныя.

2. Радыяцыйнае паражэнне. Радыеактыўнасць. Біялагічнае дзеянне іанізуючага выпраменьвання на арганізм чалавека. Вострая прамянёвая хвароба: сімптомы, першая дапамога, асаблівасці догляду за паражонымі.

3. Тэхніка накладання гарчычнікаў.

Білет № 15

1. Атручэнні ядавітымі раслінамі і грыбамі: асаблівасці пашкоджанняў, прыкметы, першая дапамога, прафілактыка.

2. Паветрана-кропельныя інфекцыі (вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, грып, ангіна): крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы, асаблівасці догляду за хворымі, прафілактыка.

3. Падрыхтоўка аднаразовага шпрыца да прымянення.

Білет № 16

1. Паняцце пра лекавыя расліны. Выкарыстанне лекавых раслін пры аказанні першай дапамогі ў палявых умовах. Правілы бяспечнага абыходжання з лекавымі раслінамі.

2. Паняцце аб рэпрадуктыўным здароўі.

3. Тэхніка накладання кампрэсаў.

Білет № 17

1. Паняцце пра ВІЧ/СНІД: крыніцы заражэння, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы, прафілактыка.

2. Дзіцячыя інфекцыі (адзёр, ветраная воспа, шкарлятына, краснуха): крыніцы інфекцыі, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы, асаблівасці догляду, прафілактыка.

3. Тэхніка выканання падскурнай ін’екцыі.

Білет № 18

1. Цяжарнасць. Фізіялагічныя і псіхалагічныя асаблівасці працякання цяжарнасці. Гігіена цяжарнай жанчыны. Уплыў алкаголю, нікаціну і таксічных рэчываў на развіццё плоду.

2. Туберкулёз: крыніцы інфекцыі, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы, асаблівасці догляду за хворымі, прафілактыка.

3. Тэхніка накладання грэлкі.

Білет № 19

1. Гігіена і культура палавых адносін. Перарыванне непажаданай цяжарнасці. Магчымыя ўскладненні.

2. Паражэнне скурнага покрыва (педыкулёз, кароста, мікраспарыя): крыніцы інфекцыі, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы, асаблівасці догляду, прафілактыка. Правілы апрацоўкі бялізны пры выяўленні педыкулёзу, каросты, мікраспарыі.

3. Тэхніка накладання павязкі на плячо.

Білет № 20

1. Змест дамашняй аптэчкі, дарожнай аптэчкі вадзіцеля. Аказанне першай дапамогі пацярпелым з выкарыстаннем дарожнай аптэчкі вадзіцеля. Правілы захоўвання лекавых сродкаў у хатніх умовах.

2. Крывяныя інфекцыі (сыпны тыф, клешчавы энцэфаліт, лейшманіёзы): крыніцы заражэння, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы, асаблівасці догляду, прафілактыка.

3. Тэхніка накладання першаснай асептычнай павязкі на перадплечча.